МАГІЛЁЎСКІЯ ВЕДАМАСЦІ
17 сакавіка 2020

Да 100-годдзя з дня нараджэння Аляксея Пысіна

# Віктар АРЦЕМ'ЕЎ



Беларускі пісьменнік, член Магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Арцем'еў – сябар і даследчык жыцця і творчасці паэта Аляксея Пысіна. Ён напісаў шмат артыкулаў, эсэ, успамінаў, нататкаў пра жыццё і творчасць вялікага паэта, пра яго месца ў беларускай літаратуры.

Віктар Арцем'еў – аўтар зборнікаў пра Аляксея Пысіна: «Вянок Аляксею Пысіну» (2006), «Паэт вузел завязаў» (2008), «Бібліятэка паэта Аляксея Пысіна» (2011), «Пысіны: ад прадзеда да праўнукаў» (2011), «Урокі Аляксея Пысіна» (2013). У 2015 годзе выйшла, як кажа сам Віктар Іванавіч, галоўная кніга яго жыцця «Пісьменнікі і кнігі». На яе старонках – асобны раздзел пысініяны «Вянок Пысіну».

Прапануем вашай увазе разважанні Віктара Іванавіча пра Аляксея Пысіна, якія змешчаны ў яго невялікай брашуры «Мужны воін, глыбінны сейбіт, светлы чалавек» (2020).

## Урок памяці

А.В.Пысін – унікальны і тонкі лірык, а пра вайну яго творчасць фенаменальная: ён сказаў сваё слова франтавіка наймацней з усіх беларускіх паэтаў, яно на ўзроўні Янкі Купалы, Аляксандра Твардоўскага, Канстанціна Сіманава. Хаця ўлады не паспелі яго ўганараваць званнем, ды ўсёроўна ён з намі, ён народны душою...

## Мінута маўчання

Памяці Аляксея Пысіна

*Яму б ляснымі сцежкамі прайсці,*
*Адчуць раптоўна подых навальніцы...*
*Шумяць трывожна сосны. Пры жыцці*
*Любіў ён слухаць шолах таямнічы.*
*Яму б у жыта спелае ўвайсці,*
*Літое зерне на сцяблах паспела...*
*Хвалюецца і жыта, пры жыцці*
*Не ўсё пераказаць яму паспела.*
*Не знікне ў папяровым забыцці*
*Радок з адвечнай думкаю ягонай.*
*Схіліся, жыта! Ён жа пры жыцці*
*Саромеўся увагі і паклонаў.*
*Замрыце, сосны! Ён жа пры жыцці*
*Так мала зведаў цішы і спакою.*
*Мо галасы ўсіх тых, хто ў небыцці,*
*Пачуў паэт хвілінай вось такою.*
*З вайны, з юнацтва дымнага, здаля*
*Паклікалі сябры-аднапалчане.*
*...Чутно, як цяжка дыхае зямля,*
*Ахутаная воблакам маўчання.*
*Маўчыць зямля травою і пяском.*
*Хвіліна цішыні на Прыдняпроўі.*
*У горле слёз нявыплаканых ком –*
*Запозненым прызнаннем у любові.*

**Святлана БАСУМАТРАВА.**

## Запаветы паэта моладзі

Аляксей Пысін пісаў творы пра маладых, пісаў і для маладых. Для юнакоў і дзяўчын ён выдаў зборнік вершаў «Вярбовы мост». Пісаў паэт і для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту: ёсць больш за дзясятак вершаў, паэмы «Кавылёк» і «Дзяўчынка Марыям» і паэмы-казкі «Алёшка», «Казярог» і «Незвычайнае падарожжа».

У сваіх творах паэт не павучае чытача, а шчыра дзеліцца з ім сакрэтамі майстэрства і з поўным даверам вядзе гамонку на роўных: ён вучыць чытача і сам вучыцца ад яго. І яму вучні і студэнты верылі. І сёння вераць. Сваімі паэтычнымі радкамі ён і сёння нясе маладым спрадвечную мудрасць народа, асвятляючы ім шлях – ён вядзе маладых у жыццё. Чытайце вершы, паэмы і казкі паэта: у іх вы знойдзеце багата парад-запаветаў, як ісці ў жыццё, як ісці па жыцці... Вось толькі некалькі з іх:

*Шчасце сеецца, жнецца,*
*Шчасце ў кузнях куецца,*
*У мартэнах кіпіць.*

*Дала мне маці гэту мову,*
*Каб не нямым пайшоў у свет.*

*На зямлі ўзыходзіць запавет –*
*Памыляцца толькі не ў галоўным.*

*Усё ад нас,*
*Зберагчы сёння трэба*
*Больш святла, цеплыні, дабраты.*

*На зямлі адзіная ўдача:*
*У вечным слове чалавекам быць.*

## Народны душою

Аляксей Пысін – Майстар прыгожага беларускага пісьменства. Ён слаўны сын Беларусі і паэт народны душою. Яго паэзія ўслаўляе каштоўнасці агульначалавечыя, вечныя і будзе жыць стагоддзі. Яна будзе жыць, пакуль жыве беларускі народ і яго родная мова.

*Дала мне маці гэту мову,*
*Каб не нямым пайшоў у свет,*
*Дала мне маці гэту мову*
*Як спадчыну і запавет.*
*Была яна не беларучкай*
*І на жніве, і на сяўбе;*
*На глебе добрай беларускай*
*Здабыты словы ўсе яе.*
*Прапахлі сонцам і падзолам,*
*Дажджамі, сокамі раслін,*
*Пад знак рукам яе мазольным,*
*Што мелі толькі ў сне пачын.*
*Дачка мая! У жыццёвай прозе,*
*У буднях і святочным днём*
*Не пакідай яе ў парозе,*
*Калі ў нечы ўвойдзеш дом.*

**Аляксей ПЫСІН.**

## Віншуем з днём нараджэння:

**1 сакавіка – Ясева Уладзіміра Віктаравіча**
**10 сакавіка – Какорыча Віктара Леанідавіча**
**10 сакавіка – Мельнікава Анатолія Леанідавіча**
**10 сакавіка – Мінчанку Мікалая Нікіфаравіча**
**21 сакавіка – Арцем'ева Віктара Іванавіча**
**21 сакавіка – Кунцэвіча Віктара Іванавіча**

# Наталля АЗАРАНКА



Наталля Азаранка нарадзілася ў вёсцы Бароньки Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Піша вершы з юнацтва як на рускай, так і на беларускай мовах. Яе паэзія вельмі лірычная. Наталля Пятроўна аднолькава лёгка і трапятліва дакранаецца сваім паэтычным пяром да розных жыццёвых тэм. Піша пра лёс, пра родную зямлю, пра час, пра людзей, пра каханне!.. Вершы Наталлі – гэта споведзь, яны напісаны ад душы і для душы, простыя і па-філасофску асэнсаваныя адначасова.

Аўтар зборнікаў вершаў «Небесных мыслей зеркала» (2010), «Вернисаж судьбы» (2018), «Тринадцать месяцев» (2020).

## Март

*Он к ней спешил из несуществованья,*
*Неся в букете нежность и азарт,*
*К весне невинной, словно на свиданье,*
*Явился светом долгожданный март!*

*Он расплескал тепло свое несмелое*
*И ласку первых утренних лучей,*
*И дрожь звенела музыкой капельною,*
*И смех ее пролился, как ручей.*

*Март трепетно обнял весну за плечи,*
*Сползла стыдливо снежная вуаль.*
*Растопит льды загадочное вече,*
*И растворится зимняя печаль.*

*А облака, очнувшись, стали выше,*
*Их разбудил восторженный скворец.*
*Набат сердец весны и марта слышен,*
*Благослови на счастье их, Творец!*

## Апрель

*Жаворонок ликующею притчей*
*Напоил простор хмельных полей.*
*На крылах огромной стаи птичьей*
*Воротился ветреный Апрель!*

*Нежный пух подарит скромным лозам,*
*Растворяя льдинок хоровод.*
*Растревожит радуги и грозы,*
*Ливнями умоет небосвод.*

*Расцелует почки в вешних грезах,*
*Растеряет зелень у алей,*
*Он прильнет к застенчивой березе,*
*Ароматом сока захмелев.*

*Как по волшебству жизнь оживает –*
*Милость несказанная небес!*
*Словно в рай ворота отворяя,*
*Радуйся, Земля! Христос Воскрес!*

## Май

*Я слышала сегодня на рассвете*
*Ту музыку, как будто бы в раю –*
*Май исполнял кантату на кларнете,*
*Пел в унисон маэстро-соловью...*

*То за рояль садился величаво,*
*Он был непревзойденный виртуоз!*
*И зелень опоила соком травы,*
*И ароматом спелых майских рос!*

*Лишь прикасался он к аккордеону,*
*Летел над миром птичий благовест,*
*Покрылись цветом розовым пионы*
*И яблони нарядней невест!*

*Встречает Май Победу на перроне*
*Ликующим оркестром в вешний час!*
*На старой, на израненной гармони*
*Играя неустанно «Венский вальс»!*

**Новыя імёны**



**ДЗЕМ'ЯНОВІЧ Раіса Рыгораўна** нарадзілася ў 1939 годзе на Гомельшчыне ў сям'і настаўнікаў. Скончыла Мазырскае педвучылішча, філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута і больш за сорак гадоў выкладала рускую і беларускую мову і літаратуру ў школах Магілёва і Магілёўскай вобласці. Выдатнік народнай асветы. Узнагароджана медалём «Ветэран працы», ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі БССР і мясцовых улад.

Член літаратурнага аб'яднання «Ветэран» пры Магілёўскім гарадскім савеце ветэранаў.

Вершы пачала пісаць яшчэ студэнткай, прысвячаючы іх прыгажосці роднай зямлі, гераічнай гісторыі беларускага краю, філасофіі жыцця.

## Брэсцкая крэпасць

*Ля каменняў стаю ў глухім аняменні,*
*Навакольнага шуму зусім не чуваць –*
*І, здаецца, я чую: гавораць камені,*
*Як байцы ў сорак першым пачалі ваяваць.*

*Як у чэрвені хмары вецер з заходу ссунуў,*
*І паліўся на крэпасць з іх агонь і свінец.*
*Як ардой незлічонай вораг к крэпасці хлынуў,*
*Несучы разбурэнні, катаванні і смерць.*

*На скамечаным полі, дзе не гояцца раны,*
*Не змываюць дажджы агнямётаў сляды –*
*Тут змагаўся Гаўрылаў, тут загінуў Наганаў –*
*Увайшоў у бяссмерце палітрук малады.*

*Многа кветак чырвоных ля магіл-абеліскаў,*
*На палітай зямлі яны шчодра ўзышлі.*
*Гэта чырвань крыві і сцягоў прамяністых,*
*Пад якімі байцы ў атакі ішлі.*

*Што ні крок – то легенда, што ні камень – то помнік,*
*Помнік людзям, чый подзвіг бессмяротны навек.*
*Прыпыніся. Паслухай. Паглядзі і запомні:*
*Тут жыццё аддавалі за цябе, чалавек!*

Літаратурную старонку падрыхтавалі: Аляксандр Казека і Святлана Казека.